ЛИТЕРАТУРА

1. Духовный регламент тщанием и повелением всепресветлейшего, державнейшего государя Петра Первого, имп. и самодержца всероссийского, по соизволению и приговору Всероссийского Духовного Чина и Правительствующего сената, в царствующем СПб., в лето от Рождества Христова 1721, сочиненный. – Изд. 4-е. – М.: Синодальная тип., 1897. – 196 с.

2. Свод законов о состояниях. Кн. 1. О разных родах состояний и различии прав, им присвоенных. Раздел второй. О духовенстве. Отделение второе. О православном духовенстве монашествующем. Отделение четвертое. О сословиях духовенства Православного. 1904 г. // Полный свод законов Российской империи / сост. под ред. Г. Савича. – Т. 9. – Ч. 1. – № 409 – 425; 432 – 442. – С. 47 – 50.

3. Клировая ведомость за 1906 год // Нац. ист. архив Респ. Беларусь (НИАРБ). – Ф. 2315. – Оп. 1. – Д. 35.

4. Клировая ведомость монастырей гг. Могилева, Мстиславля и Орши и уездов Быховского, Гомельского, Могилевского, Мстиславского, Сенинского и Чериковского за 1916 год // НИАРБ. – Ф. 2301. – Оп. 1. – Д. 716.

5. Дело о монашествующих и послушницах за 1863 год // НИАРБ. – Ф. 136. – Оп. 1. – Д. 30599.

6. Дело о монашествующих и послушниках за 1876 год // НИАРБ. – Ф. 136. – Оп. 1. – Д. 35413.

7. Игумения Нина (Боянус). Наша беседы о жизни. Жизнеописание, письма, воспоминания – Полоцкий Спасо-Евфросиниевский монастырь / Нина (Боянус). – М.: Изд-во Сретенского монастыря. – 2004. – 208 с.

8. Балашова, Т.В. Московские монастыри в социально-культурной среде столичного города второй половины XIX – начала XX вв.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.00, 07.00.02 / Т.В. Балашова. – М., 2007. – 248 с.

9. Указы МДК. Списки монастырских крестьян с указанием недоимок хлеба и др. за 1842 г. Ведомости недвижимого имущества Могилевского Архиерейского Дома и монастыря за 1842 г. // НИАРБ. – Ф. 2315. – Оп. 1. – Д. 18.

10. Клировая ведомость церквей монастыря за 1842 год. Расписание выдачи жалования монахам и послушницам за 1842 г. // НИАРБ. – Ф. 2315. – Оп. 1. – Д. 27.

11. Клировая ведомость Мозоловского и Тупичевского Свято-Духова монастырей за 1890 год // НИАРБ. – Ф. 2314. – Оп. 1. – Д. 55.

12. Устав Духовных Консисторий. – СПб.: Синод. тип., 1898. – 200, IV с.

13. Распоряжение епархиального начальства // Полоцкие епархиальные ведомости – 1891. – № 23 (отдел официальный). – С. 1067.

14. Зырянов, П.Н. Русские монастыри и монашество в XIX – начале XX вв. / П.Н. Зырянов // Монашество и монастыри в России XI – XX вв. – М.: Наука, 2005. – 344 с.

15. Зырянов, П.Н. Русское монашество конца XIX – начала XX вв. / П.Н. Зырянов // Церковь и время. – 2002. – № 1. – С. 179 – 193.

16. Высочайше утвержденный Устав Духовных Консисторий. 27 марта 1841 г. // Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – Т. 16. – Отд. 1. – № 14409. – С. 221 – 263.

17. Указы Синода и Консистории 1855 – 1886 гг. // НИАРБ. – Ф. 2301. – Оп. 1. – Д. 34.

18. Клировая ведомость за 1890 г. // НИАРБ. – Ф. 2315. – Оп. 1. – Д. 32.

19. Списки монашествующих и послушников Оршанского Кутеинского Успенского монастыря за 1880 – 1882 гг. // НИАРБ. – Ф. 2315. – Оп. 1. – Д. 154.

20. Послужные списки монахов и послушников монастыря за 1858 г. // НИАРБ. – Ф. 3023. – Оп. 1. – Д. 216.

**УДК 94 (476) "1921/1939"**

## АЎТАМАБІЛІ І ДАРОГІ Ў БРАСЛАЎСКІМ ПАВЕЦЕ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС (1921 – 1939 гг.)

***Р.Г. БУГАЕВІЧ***
**Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск**

*Даследуецца праблема развіцця аўтамабільнага транспарта і дарожных камунікацый у Браслаўскім павеце ў 1921 – 1939 гг. Аналізуецца аўтамабільны парк і дарожная інфраструктура Браслаўшчыны ў міжваенны час.*

Паводле Рыжскага мірнага дагавора, падпісанага 18 сакавіка 1921 года паміж Савецкімі Расіяй і Украінай, з аднаго боку, і Польшчай – з другога, беларуская этнічная тэрыторыя была падзелена. Заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы.

Гісторыя Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду стала прадметам шматлікіх даследаванняў беларускіх і замежных навукоўцаў. Нягледзячы на вялікую колькасць прац, некаторыя аспекты гісторыі міжваеннага часу патрабуюць больш грунтоўнага разгляду. Да такіх аспектаў можна аднесці тэму транспарта і камунікацый.



Polotsk SU

Мэтай дадзенага артыкула з’уяляецца адлюстраванне развіцця аўтамабільнага транспарта і дарожных камунікацый ў адзначаны перыяд на тэрыторыі Браслаўскага павета. У артыкуле выкарыстаны разнастайныя дакументальныя крыніцы, частка з іх упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак.

Якая дарожная інфраструктура дасталася ў “спадчыну” польскім уладам на Браслаўшчыне?

Як сцвярждае Ст. Валасовіч у сваей працы “Ziemia Wileńska”, расійскі царскі ўрад асабліва не займаўся дарожным будаўніцтвам. Брукаванай была нязначная частка дарог. Даволі шмат было “гасцінцаў”. Гэтыя дарогі вясной і ў часы працяглых дажджоў разбіваліся коламі і цалкам былі непрыдатнымі для праезду, таму большасць рухалася збоку ад дарогі [13, s.84].

У гады Першай сусветнай вайны немцы і рускія ў прыфрантавой паласе пабудавалі ў вайсковых мэтах шмат дарог, якія былі высцеленыя дошкамі ці звычайнымі круглымі пнямі [13, s. 85]. Гэтыя круглякі, асабліва летняй парой з’яўляліся катастрофай для транспартных сродкаў і падарожных [6, л. 46].”

Агульны стан дарожнай гаспадаркі Браслаўскага павета ілюструе рапарт паліцэйскага з Дукштаў ад 13 кастрычніка 1922 г.: “Масты і дарогі ў гміне Дукшты ў дрэнным стане, за выключэннем некалькіх мастоў. Масты ў некаторых мясцовасцях загароджаныя дротам, людзі вымушаны аб’ яжджаць палямі. Пры чым можна аб’ехаць толькі днем, ноччу на конях немагчыма ехаць. <…> У гміне адсутнічаюць дарожныя ўказальнікі, за выключэннем тых, якія зробленыя польскімі салдатамі і напісаныя алоўкамі [2, л. 17 зв.].” Патрабаванні паліцыі аб прывядзенні ў парадак дарог і мастоў гмінныя ўлады пакідалі без ўвагі, матывуючы гэта адсутнасцю сродкаў у бюджэце гміны, пры тым паведамляючы, што адразу распачнуць рамонт па атрыманні грошай.

Стан дарог і мастоў істотна не змяніўся на пачатку 1923 г. Як даносіў староста Браслаўскага павета ў Вільню: “Стан дарог паказвае тое, што з часу прыпынення баявых дзеянняў нічога не зроблена, на дзяржаўных і камунальных дарогах няма ніводнага цэлага маста [6, л. 46].

Нягледзячы на цяжкасці паступова ішло аднаўленне дарог і мастоў на Браслаўшчыне. Фінансаванне аднаўленчых работ вялося як з дзяржаўнага бюджэта, так і з мясцовага. Напрыклад, каб выкапаць рвы паабапал дарогі на адрэзку 1 км затрачвалася 417 злотых [5, л. 10]. Да рамонтных работ прыцягвалася мясцовае насельніцтва. Так, для рамонту павятовай дарогі ля мястэчка Казьяны па загаду войта Богінскай гміны Байнаровіча кожны ўладальнік каня павінен быў вывесці 3 м³ жвіру. Пры тым, будаўнічы матэрыял было загадана браць з сялянскіх палосак [1].

За адмову ад работ грамадзяніна маглі прыцягнуць да адказнасці пакараннем у выглядзе значнага штрафу або некалькімі суткамі арышту [4].

За два міжваеныя дзесяцігоддзі былі забрукаваныя каля 30 кіламетраў дарог. 5 лістапада 1929 г. было скончана будаўніцтва адрэзка дарогі Вільня – Відзы (7,8 км ад мяжы Свянцянскага і Браслаўскага паветаў да Відзаў). Будаўніцтва дарогі вялося за кошт дзяржавы [9].

Дарогі ў ІІ Рэчы Паспалітай дзяліліся на 3 класы ў залежнасці ад эканамічна-камунікацыйнага значэння дадзенай дарогі, а таксама ад іншых спецыяльных умоў. Да І класа залічваліся дзяржаўныя дарогі, да ІІ класа – ваяводскія і павятовыя дарогі, да ІІІ класа – гмінныя дарогі [7, s. 393].

Да дзяржаўных дарог адносіліся: Іказнь – Браслаў – мяжа Латвіі; мяжа Свянцянскага павета – Відзы– Дрысвяты – мяжа Латвіі (мал. 1).

Ваяводскія і павятовыя дарогі:

1) Браслаў – Опса – Відзы – Тверыч;
2) Браслаў – Слабодка – Друя;
3) Браслаў – Турмонты;
4) Дрысвяты – Рымшаны – Дукшты – Казаўшчына;
5) Друя-Леанпаль-Міеры-Новы Пагост;
6) Опса-Богіна-Казьяны (мал. 1).

Усе астанія дарогі адносіліся да гмінных [2, л. 58].

Умовы для развіцця аўтамабільнай галіны былі складанымі. Дарогі былі дрэннымі, імпартныя аўтамабілі з прычыны вялікіх мытных плацяжоў не былі таннымі, эксплуатацыя была складанай і дарагой. Нягледзячы на гэтыя цяжкасці, некаторыя жыхары Браслаўшчыны маглі дазволіць сабе аўтамабіль (а некаторыя, нават два аўтамабілі) або матацыклы.

Са спіса аўтамабіляў, якія прайшлі тэхнічны агляд на пачатку 1935 г., мы можам даведацца, што па стану на 1 лютага 1935 г. у Браслаўскім павеце было зарэгістравана 2 грузавыя, 1 аўтобус і 11 легкавых аўтамабіляў [3, л. 178, 178 зв.]. Гаспадар маентка Бельмонты (нейкі час выконваў абавязкі старасты Браслаўскага павета) Мар’ян Радэцкі-Мікуліч меў 2 аўтамабілі: Peugeot на 3 месцы і Fiat (1926 г.в.) на 7 месц. Лекар павятовага шпіталю Каласоўскі Зыгмунд валодаў айчынным аўтамабілем Fiat Polski 508.



Polotsk SU

Гэты быў адным з найпапулярнейшых аўто ў Польшчы ў 1930-я гг. Моц рухавіка была 20 КС, максімальная хуткасць – 85 км/г, расход паліва – 8 л / 100 км [11]. Яшчэ адзін Fiat, але італьянскай вытворчасці (Fiat 514), быў ва ўласнасці Мар'яна Пелікана з Відзаў.




Мал. 1. Карта аўтамабільных дарог Браслаўскага павета

Распаўсюджанымі былі аўтамабілі маркі Ford. Так, адвакату з Відзаў Тымінскаму Атаназы і Валаньскай Ганне, жонцы лекара з Друі, належылі Ford A. На базе Ford A быў пабудаваны грузавік Ford AA, які мог перавезці 1,5 т груза з максімальнай хуткасцю 70 км/г., іх было на Браслаўшчыне 2 адзінкі [10]. Грузавымі перавозкамі на гэтых машынах займаліся Бяляк Рахмель з Браслава і Пізані Канстанты з фальфарка Антопруце Рымшанскай гміны.

Больш сціплай была мадэль Ford T, якую змаглі сабе дазволіць Кавальскі Тэадор, выкладчык гімназіі ў Відзах, і Жаба Раман, уладальнік маентка Друйка Слабодскай гміны.

Павятоваму шпіталю ў Браславе належала аўтамашына чэхаславацкага вытворцы Tatra 30, абсталяваны 4-цыліндравым рухавіком, які развіваў максімальную хуткасць 90 км/г [12].

Гандляру Бітаўту Антонію з Браслава належыў Chrysler 62, дзяржаўнаму службоўцу Гадэйскаму Рычарду – "даваенны" Packard.

Згодна даных усеагульнага перапіса насельніцтва 1931 г. у Браслаўскім павеце пражывала 143 тыс. чалавек [8, s. 1]. Адпаведна атрымліваецца, што адзін легкавы аўтамабіль прыходзіўся на 13 тыс. чалавек.

Матацыклаў у павеце было не на шмат болей за аўтамашыны – 17 адзінак [3, л. 178 зв.]. Ровар быў амаль у кожнага 200-га жыхара павета, на ўвесь павет прыходзілася 695 адзінак [3, л. 42].

Адзіная аўтазапраўка размяшчалася ў Браславе. Аднак паліва не заўседы было ў наяўнасці [3, л. 89].

Пасля Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў дарогі і масты знаходзіліся ў занядбаным стане. Адчуваўся недахоп фінансавых сродкаў для рамонтных работ. Аднак паступова павятовыя ўлады пры ўдзеле мясцовага насельніцтва рамантавалі масты і дарожнае пакрыцце на дарогах дзяржаўнага значэння, а затым – павятовага і гміннага. Да канца 1930-х гадоў было забрукавана каля 30 кіламетраў дарог.

Узровень аўтамабілізацыі павета быў нізкім. Большасць насельніцтва не магла дазволіць сабе набыць нават ровар, не кажучы пра больш дарагую тэхніку. На Браслаўшчыне былі зарэгістраваны аўтамабілі як польскай, так і замежнай вытворчасці, аднак аўтаўладальнікі аддавалі перавагу амерыканскім машынам (Ford).

ЛІТАРАТУРА

1. Гаспадаруюць, як хочуць // Народная справа. – 15.09.1926. – №17, с. 3.
2. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна (ЗДАМ). – Ф. 436. – Воп. 1. – Спр. 356.
3. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (LCVA). – Ф. 51. – Воп. 10. – Спр. 80.

4. LCVA. – Ф. 51. – Воп. 15. – Спр. 465.
5. LCVA. – Ф. 51. – Воп. 15. – Спр. 918.
6. LCVA. – Ф. 51. – Воп. 15. – Спр. 1935.
7. 20-lecie komunikacji w Polsce Odrodzonej / Wydaw. i nakł. Koncern Prasowy "Ilustrowany Kuryer Codzienny". – Kraków, 1939. – 543 s.
8. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9. XII 1931 R. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Wileńskie, bez miasta Wilna. – Warszawa, 1936. – 164 s.
9. Dziennik Wileński. – 05.11.1929. – №254, s. 3.
10. Oldtimer gallery. Trucks. GAZ-AA board platforms // Oldtimers picture gallery [Электронны рэсурс]. – 2005. – Рэжым доступу: http://www.autogallery.org.ru/gazaa.htm – Дата доступу – 20. 03. 2014.
11. Samochody FIAT 508 // Polska Motoryzacja 1918 - 1945 [Электронны рэсурс]. – 2005. – Рэжым доступу: http://old.timer.pl/fiaty.html – Дата доступу – 20. 03. 2014.
12. Tatra 30 // Tatra portal - Web site about TATRA cars and trucks [Электронны рэсурс]. – 2009. – Рэжым доступу: http://www.tatraportal.sk/?ukaz=popisky/t30_sk&lang=sk – Дата доступу – 20. 03. 2014.
13. Wołłosowicz, Stanisław. Ziemia Wileńska / Nakładem księgarni geograficznej „Orbis”. – Kraków, 1925. – 130 s.

**УДК 930.2"1914/1919"**

## ДЗЁННІКАВЫЯ ЗАПІСЫ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***І.М. ВАШКЕЛЬ***
**Навукова-даследчая ўстанова культуры «Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў», Браслаў**

*Артыкул падрыхтаваны на аснове вывучэння і аналізу падзей Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, менавіта ў Браслаўскай вобласці. Ён паказвае, што гэта былі гады велізарных чалавечых страт, агульнага масавага гераізму і трагедыі, таксама прыцягвае ўвагу да праблемы захавання ваенных пахаванняў і ўмацаванняў Першай сусветнай вайны на ўсей тэрыторіі баявых дзеянняў.*

**Они сражались…**
**И не щадили жизнь свою –**
**Теперь лежат в земле спокойно.**
**Да славься тот, кто пал в бою!**

Эпітафія складзеная ў памяць загінуўшых салдат,
пахаваных на тэрыторыі Браслаўшчыны ў в.Паўлаўка

Да гэтай пары многія не ўяўляюць, наколькі драматычнымі былі наступствы Першай сусветнай вайны для Браслаўшчыны. З восені 1915 г. да 1918 г. рэгіён падзяляла лінія фронту паміж расійскімі і германскімі войскамі. Першая сусветная вайна – гэта велізарныя разбурэнні ў прыфрантавой зоне, гэта больш за сотню расійскіх і нямецкіх вайсковых пахаванняў, гэта тысячы перасяленцаў і ўцекачоў, многія з якіх не вярнуліся ў родныя мясціны, гэта амаль знішчаная эканоміка краю, гэта эвакуацыя маёмасці ўглыб імперыі, з якой амаль нічога не вярнулася назад, гэта тысячы землякоў, мабілізаваных у расійскае войска, страты сярод якіх ніхто яшчэ не падлічыў, гэта высечаныя лясы, знішчаная жыўнасць, перарытыя акопамі, бліндажамі і іншымі ваеннымі збудаваннямі палеткі. Падзеям Першай сусветнай вайны можна прысвяціць грунтоўную манаграфію. Тысячы архіўных спраў у Беларусі, Польшчы, Літве, Латвіі, Расіі, Германіі чакаюць сваіх даследчыкаў. Шмат матэрыялаў даюць і краязнаўчыя пошукі на Браслаўшчыне. Акрамя музея, гэтым напрамкам найбольш актыўна займаюцца краязнаўцы Дрысвяцкай, Грытунскай, Відзаўскай школ Браслаўскага раёна.

Прыўзняць заслону над малавядомай старонкай гісторыі Браслаўшчыны дазваляюць матэрыялы архіваў, у першую чаргу, Расійскага Дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва ў Маскве. Дзе захоўваюцца дакументы армейскіх фарміраванняў, якія прымалі ўдзел у ваенных дзеяннях на Браслаўшчыне. Архіўныя пошукі стваральнікаў кнігі “Памяць” [6] Браслаўскага раёна дапамаглі выявіць велізарныя па аб’ёму матэрыялы. Краязнаўчыя звесткі па гэтай тэме мэтанакіравана збіраў краязнавец, настаўнік Сяргей Львовіч Адамовіч. У кнігу ўвайшла толькі малая частка таго, што было прывезена з архіваў. Асобныя старонкі вайны асветлены ў гістарычных зборніках “Браслаўскія сшыткі” (т.1, 1996; т.3, 1999, т.4, 2000). Аднак значная частка назапашанага музеем матэрыялу чакае свайго часу. У фондах музейнага аб’яднання знаходзіцца шмат экспанатаў часоў Першай сусветнай вайны: рэшткі



Polotsk SU